КНІЖНАЯ СПАДЧЫНА ПОЛАЦКАГА ЕЗУІЦКАГА КАЛЕГІУМА Ў ФОНДЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

ТАЦЦЯНА САПЕГА

Анатацыя: У артыкуле даследуецца кніжная культура Полацкага езуіцкага калегіума, элементамі якой з'яўляюцца: кнігі з бібліятэкі; выдавецкая прадукцыя друкарні; кнігі выкладчыкаў калегіума. Аналіз правененцый кніг з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі дазваляе даследаваць міграцыю кніг з бібліятэкі і распаўсюджванне выдавецкай прадукцыі друкарні.

Ключавыя словы: кніжная культура, старадрукі, бібліятэка, друкарня, Полацкі езуіцкі калегіум, Нацыянальная бібліятэка Беларусі.

BOOK HERITAGE OF THE POLACK JESUIT COLLEGIUM IN THE FUNDS OF THE NATIONAL LIBRARY OF BELARUS

Abstract: The book culture of the Polack Jesuit Collegium including such elements as the books from the library, published products of the printing house, and Collegium lecturers' books is considered in this article. The analysis of the books' provenances from the funds of the National Library of Belarus allows to investigate the migration of books from the library and distribution of the printing house's published products.

Keywords: Book Culture, Old Printed Books, Library, Printing House, Polack Jesuit Collegium, National Library of Belarus.

Даследаванне кніжнай спадчыны Полацкага езуіцкага калегіума патрабуе комплекснага падыходу, калі вывучаецца сукупнасць элементаў, якія складаюць адно цэлае. У дадзеным даследаванні цэлым выступае кніжная культура Полацкага езуіцкага калегіума, а элементамі з'яўляюцца наступныя аб'екты даследавання (Схема 1):

1. кнігі з бібліятэкі калегіума;
2. кнігі, выдадзеныя ў друкарні калегіума;
3. кнігі выкладчыкаў калегіума.

Схема 1. Структура даследавання кніжнай культуры Полацкага езуіцкага калегіума



Перспектыўным вынікам комплекснага даследавання кніг з бібліятэкі Полацкага езуіцкага калегіума павінны стаць:

1. бібліяграфічная рэканструкцыя, бібліяметрычны аналіз бібліятэкі і даследаванне міграцыі кніг у іншыя кнігазборы;
2. узнаўленне выдавецкага рэпертуару, яго бібліяметрычны аналіз і даследаванне распаўсюджвання прадукцыі друкарні;
3. даследаванне кніг выкладчыцкага складу калегіума.

Бібліятэка калегіума – адзін з найбуйнейшых на тэрыторыі Беларусі гістарычных кнігазбораў, які ствараўся з 1580-х па 1820-я гады. Сёння фрагменты бібліятэкі захоўваюцца ў зборах Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі. Частка кнігазбору, што паступіла ў 1920-я гады, захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (далей – НББ). Па правененцыях на сённяшні дзень выяўлена больш за дзвесце кніг. Многія з іх маюць правененцыі некалькіх уладальнікаў, напрыклад Полацкага езуіцкага

калегіума і Магілёўскай духоўнай семінарыі або Віцебскай гімназіі (Ілюстрацыя 1).

Ілюстрацыя 1. Пячаткі бібліятэк Полацкага езуіцкага калегіума і Магілёўскай семінарыі на тытульным аркушы

Пры калегіуме ў 1787–1820 гадах дзейнічала друкарня, якая выдавала навучальныя і навуковыя выданні, падручнікі, слоўнікі, літаратурныя і філасофскія творы, літургічную літаратуру. Кніжная прадукцыя ў абавязковым парадку паступала ў фонды бібліятэкі калегіума. Найбольш ранняе выданне друкарні ў фондзе НББ – 1788 года. Гэта падручнік па рыторыцы «De arte rhetorica libri quinque». Аўтар кнігі – Дамінік дэ Калоніа, вядомы езуіт, прафесар езуіцкага каледжа ў Ліёне, дзе ўзначальваў кафедры рыторыкі і багаслоўя. Першае выданне ягонай кнігі па рыторыцы было надрукавана ў Ліёне ў 1704 годзе і мела шматлікія перавыданні, у тым ліку ў Полацку (Colonia, 1788).

Аналіз правененцый дазваляе канстатаваць, што кніжная прадукцыя друкарні належала бібліятэкам адукацыйных устаноў і прыватным зборам. Гэта пацвярджаюць правененцыі езуіцкіх калегіумаў у Магілёве і Віцебску, Віцебскіх гімназіі і семінарыі, бібліятэкі Радзівілаў і іншыя.

Для комплекснага даследавання кніжнай культуры калегіума патрабуецца таксама вывучэнне кніжнай спадчыны, якую пакінулі яго выкладчыкі. Першапачаткова калегіум прымаў выкладчыкаў-выхадцаў з польскіх школ, але паступова ператварыўся ў адзін з цэнтраў

падрыхтоўкі педагагічных кадраў ордэна (Филиппенко, 2013). Кнігі высокаадукаваных прадстаўнікоў выкладчыцкага складу, безумоўна, выкарыстоўваліся ў калегіуме, захоўваліся ў бібліятэцы.

Першым рэктарам Полацкага езуіцкага калегіума быў Пётр Скарга (1536–1612). У НББ захоўваецца дзесяць прыжыццёвых выданняў і васямнаццаць пазнейшых выданняў XVII–XVIII стагоддзяў гэтага царкоўнага і палітычнага дзеяча. Асобнікі надзвычай цікавыя, багатыя на маргіналіі, правененцыі і патрабуюць падрабязнага даследавання. Большасць з іх выдадзена ў Кракаве і віленскай Акадэмічнай друкарні. Захоўваюцца таксама ўнікальныя асобнікі, напрыклад, выдадзены ў друкарні Пінскага езуіцкага калегіума (Skarga, 1735), з экслібрысам бібліятэкі Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў (Skarga, 1600).

Выкладчыкам рыторыкі ў Полацкім езуіцкім калегіуме ў розныя гады быў паэт, філосаф і тэарэтык літаратуры Мацей Казімір Сарбеўскі (1595–1640). Ён выкладаў у Полацкім езуіцкім калегіуме (1618–1620, 1626–1627), Нясвіжскім езуіцкім калегіуме (1625–1626) і Віленскай езуіцкай акадэміі (1620–1622, 1628–1635). Полацкія і віленскія курсы лекцый рыторыкі і паэтыкі леглі ў аснову яго навуковых трактатаў. У 1622–1625 гадах ён вывучаў у Рыме метафізіку і тэалогію, праславіўся як аўтар эпіграм, одаў, гімнаў і быў узнагароджаны папам Урбанам VIII лаўровым вянком і медалём (Конан, 1972; Чарнышова, 1991). М.К. Сарбеўскі больш вядомы як выдатны лацінамоўны паэт, які быў вельмі папулярны ў Еўропе. Доўгі час вершы Сарбеўскага вывучаліся ў еўрапейскіх навучальных установах XVII–XIX стагоддзяў як дасканалы ўзор новалацінскай паэзіі. Найбольш славутым яго выданнем лічыцца «Lyricorum libri IV», якое было надрукавана ў Антверпене ў знакамітай друкарні Плантэна ў 1632 годзе і выйшла пяцітысячным накладам. У НББ маецца асобнік гэтага выдання добрай захаванасці з гравіраваным тытульным аркушам (медзярыт) па эскізе фламандскага мастака Пітэра Паўля Рубенса. Гравёрам тытула кнігі «Lyricorum libri IV» з'яўляецца Карнэліс Гале (Sarbiewski, 1632).

У фондзе НББ захоўваецца яшчэ адна кніга Мацея Казіміра Сарбеўскага – «Carmina», выдадзеная ў Парыжы ў XVIII стагоддзі (Sarbiewski, 1759). У пачатку кнігі змешчаны артыкул пра аўтара. Асобнік у аправе XVIII стагоддзя: скура карычневага колеру на кардоне; на вечках цісненне золатам – трайная лінейная рамка; на спінцы цісненне золатам – раслінны арнамент; залаты абрэз.

Справу Сарбеўскага працягнуў адзін з яго вучняў – Сігізмунд Лаўксмін (1597–1670), які ў Полацку вывучаў (1618–1619), а пасля выкладаў рыторыку (1629–1631). Скончыў таксама Віленскі ўніверсітэт, выкладаў паэтыку ў Нясвіжы (1631–1635), філасофію ў Віленскім універсітэце

(1635–1638), тэалогію і кананічнае права ў Вільні, Бранёве, Полацку, Пінску. Быў рэктарам Полацкага калегіума, віцэ-рэктарам і праканцлерам Віленскага ўніверсітэта, наведваў з афіцыйнай місіяй Рым. С. Лаўксмін з'яўляўся аўтарам першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, музыцы і рыторыцы, якія карысталіся папулярнасцю да канца XVIII стагоддзя (Чернышева, 1980). У фондзе НББ захоўваецца кніга С. Лаўксміна па тэалогіі, выдадзеная ў Акадэмічнай друкарні (Lauxmin, 1675).

Даследаванне кніжнай спадчыны Полацкага езуіцкага калегіума паспрыяе больш глыбокаму вывучэнню і разуменню культурных і адукацыйных працэсаў, якія адбываліся ў навучальнай установе.

Бібліяграфія

1. Конан, Уладзімір (1972). "Полацкі курс паэтыкі М. К. Сарбеўскага (1618–1627 гг.)", *Весці Акадэміі навук БССР,* 1: 113–122.

2. Филипенко, Владимир (2013). *Коллегиум, академия, университет: вехи истории и традиции Полоцкой alma mater.* Витебск: Витебский областной центр маркетинга.

3. Чарнышова, Людміла (1991). "Сарбеўскі – у нашай спадчыне", *Спадчына,* 3: 95–109.

4. Чернышева, Людмила (1980). "Латиноязычная традиция в культуре белорусского барокко", *Белороссика: книговедение, источники, библиография.* Минск: Фундаментальная библиотека: 68–80.

5. Colonia, Domenico de (1788). *De arte rhetorica libri quinquei.* Polociae: Typ.Coll.Soc.Jesu.

6. Lauxmin, Sigismund (1675). *Theologia ecclesiastica.* Vilnae: Typis Academicis.

7. Sarbiewski, Maciej Kazimierz (1632). *Lyricorum libri IV.* Antverpiae: ex officina Plantiniana Balthasaris Moreti.

8. Sarbiewski, Maciej Kazimierz (1759). *Carmina.* Paris: Typis J. Barbou.

9. Skarga, Piotr (1600). *Kazania o siedmi sakramentach kościoła s. Katholickiego.* Kraków: Drukarna Andrzeia Piotrkowczyka.

10. Skarga, Piotr (1735). *Kazania na niedziele y święta całego roku.* Pińsk: Drukarna Collegium Societatis Jesu.